# Трыгер яднання

## Родная мова як маці – хіба можна падзяляць ці забыць яе?

На нядаўняй сустрэчы-нарадзе з навукоўцамі сярод іншага Аляксандр Лукашэнка гаварыў пра мову. Нашу родную, беларускую. Так кіраўнік дзяржавы і сказаў. І падкрэсліў: мова – гэта тое самае «штосьці», што адрознівае беларусаў ад іншых. І ад гэтага адыходзіць не трэба, а, наадварот, варта падумаць над тым, каб кожны беларус ведаў сваю родную мову. Нельга забываць яе. Калі мы не будзем ведаць беларускай мовы, мы не беларусы, зазначыў Прэзідэнт. На яго думку, трэба імкнуцца да таго, каб кожны беларус мог размаўляць на беларускай мове. Прычым ніякая гаворка пра прымусовае насаджэнне ці так званую мяккую беларусізацыю не ідзе: і руская, і беларуская мовы – «гэта наша».

Кіраўнік дзяржавы, безумоўна, меў рацыю, калі казаў, маючы на ўвазе беларускую мову, што «пад уражаннем жніўня 2020 года пачалі неяк выплюхваць з гэтай вадой

**Міжнародны дзень роднай мовы абвешчаны Генеральнай сесіяй ЮНЕСКА ў лістападзе 1999 года і адзначаецца ва ўсім свеце штогод 21 лютага.**
**З прапановай увесці такі дзень выступіў Бангладэш. Цікава, што сярод 25 краін, якія далучыліся да рэзалюцыі ЮНЕСКА, была Беларусь. Сёлета свята роднай мовы адзначаецца 22-гі раз.**
**У свеце налічваецца больш як 6000 тысяч моў, палова з іх пад пагрозай знікнення. Гэты дзень – яшчэ адна нагода задумацца пра лёс мовы, якую мы называем матчынай.**

**Як свята… Дзень роднай мовы ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. 21 лютага 2020 года**



каламутнай… І дзіця можам выплюхнуць». Гэтага ні ў якім разе не павінна быць, і моладзь гэта нармальна разумее, падвёў рысу Прэзідэнт.

Скажу шчыра: мудрыя, узважаныя словы Прэзідэнта як бальзам на душу, яны вельмі своечасовыя і патрэбныя. Бо за нейкі год з нечым сапраўды адбылася дзіўная і незразумелая метамарфоза: «дзіця» раптам, быццам па чыёйсьці ліхой волі, стала атаясамлівацца з пратэстнымі настроямі, з «неверагоднымі».

Як такое адбылося? Лічу, у значнай меры таму, што не разабраўшыся – ці то ў эмоцыях, ці то ад жадання хутчэй з гэтым бязладдзем скончыць – зачапіліся за «кручок», які закінулі ў грамадскі вір заходнія «дабрадзеі». Зразумела, з якой мэтай – зламаць беларусаў на тым, што можа іх раз'яднаць, пасварыць, выклікаць нянавісць адно да аднаго. Лагічна, што ўзяліся «пагуляць» з сімволікай і мовай. Гэта, бадай, самыя адчувальныя, шматзначныя, сутнасныя катэгорыі. Трыгеры раз'яднання, як вызначыў нехта з нашых навукоўцаў.

Згадайце, як тыя ж тэлеграм-каналы, што сёння маюць належны ім статус экстрэмісцкіх, летам 2020-га раптам горача «палюбілі» беларускую мову. Нават рэсурсы, якія раней на ёй ніводнага слоўца не напісалі, а калі што і крэмзалі, то выключна праз гугл-перакладчык. Але пазарэз былі патрэбны «сімвалы змагання» і па той бок мяжы іх старанна ляпілі з чаго маглі і як маглі. Родная, матчына мова таксама павінна была стаць разменнай манетай. Так яны хацелі.

Як ні прыкра, трэба прызнаць: клюнулі! Пачалі не тое што цурацца, а неяк асцярожна абыходзіць бокам «нязручныя» моўныя пытанні, замоўчваць іх. Заўважна паменела роднай мовы на вуліцы і ў грамадскіх месцах. Беларускамоўны чалавек у Беларусі пачаў выклікаць насцярожанасць і зразумела якія асацыяцыі. Нармальна гэта? Безумоўна, не. Родная мова – гэта зусім не лакмусавая паперка, па якой вызначаюць «не тыя» палітычныя погляды і негатыўнае стаўленне да ўлады. Што яна дакладна пакажа, то хіба ўзровень адукаванасці і інтэлігентнасці яе носьбіта. І патрыятызм. Так, менавіта патрыятызм – людзі, якія шануюць родную мову, усім сэрцам любяць Беларусь, ведаюць гісторыю роднага краю, адданыя Радзіме і справамі, і думкамі сваімі. Магчыма, я перабольшваю і не ўсё так адназначна, тым не менш рацыянальнае зерне ў гэтым ёсць.

Заўважце, Прэзідэнт гаварыў пра моладзь, якая «нармальна разумее». Не думаю, што гэта выпадкова – кіраўніку нашай дзяржавы ўвогуле не ўласцівыя выказванні, якія нічога не значаць, ён выдатна адчувае пульс грамадскага жыцця. А родная мова сёння – модны

## ТОП-10 ЦЫТАТ ПРА МОВУ (ПА ВЕРСІІ «БЕЛАРУСКАЙ ДУМКІ»)

*Любіце і шануйце, як святыню, роднае слова, з якім вас літасцівы Бог на свет пусціў* ***(Францішак Скарына)****.*

*Трэба любіць, ведаць і шанаваць мову свайго народа і ўмець дасканала валодаць ёю* ***(Якуб Колас)****.*

*Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё згубіў* ***(Уладзімір Караткевіч)****.*

*Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам, бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам* ***(Янка Сіпакоў)****.*

*Толькі тады цябе ўсе будуць шанаваць як чалавека, калі сам сябе будзеш шанаваць – калі не адкінеш свайго нацыянальнага ўласнага багацця. А першы скарб нацыянальны – гэта родная мова* ***(Змітрок Бядуля)****.*

*Яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову, але найперш трэба знаць сваю* ***(Францішак Багушэвіч)****.*

*Мова – гэта вялікі народны скарб. Яе нельга не паважаць, як нельга не паважаць родны народ* ***(Іван Мележ)****.*

*Хто не шануе родную мову, той не шануе сябе самога, ні свой род, ні сваіх дзядоў-бацькоў, якія той жа мовай гаварылі* ***(Вацлаў Ластоўскі)****.*

*З усяго таго, што лягло назаўсёды ў аснову святыні народа, бяссмерця яго, – ты выткана, дзіўная родная мова* ***(Максім Танк)****.*

*Там, дзе не шануюць роднай мовы, мялеюць рэкі, нішчацца дубровы, народ той мёртвы, а той край нямы* ***(Генадзь Бураўкін)****.*

трэнд у маладзёжным асяродку. Некаторыя спецыялісты сцвярждаюць: цікавасць да яе нават большая, чым да англійскай. Цяжка сказаць, на якіх даследаваннях грунтуюцца падобныя заявы. Відаць, яны некаму грэюць душу і толькі. Бо насамрэч гэта пакуль з разраду мараў. І ўсё ж тэндэнцыя пэўная ёсць, яна заўважная, навідавоку: моладзь не цураецца роднай беларускай мовы, не грэбуе народнымі традыцыямі, цікавіцца айчыннай гісторыяй.

Дык што рабіць? На мой погляд, як мінімум трэба парадавацца – перад намі неабыякавае, здольнае маладое пакаленне, якому працягваць справы папярэднікаў. Усё, што цяпер патрэбна, – гэта дыялог на роўных, паважлівае стаўленне, сяброўская парада і падтрымка. А падзяляць моладзь па моўнай прыкмеце, яе стаўленні да роднай мовы і выпіхваць кагосьці «за рысу», дзе іх з радасцю прымуць нашы ідэалагічныя ворагі, – глупства несусветнае.

Год таму, напярэдадні VI Усебеларускага народнага сходу, «Беларуская думка» арганізавала круглы стол, падчас якога абмеркавалі і гэта пытанне. Ужо было адчуванне, што часам робяцца неабдуманыя крокі, якія ў выніку нічога добрага не даюць, хутчэй наадварот. Спявак і кампазітар, мастацкі кіраўнік гурта «Беларусы» Валерый Шмат гаварыў тады, што недаравальна мала ўвагі надаём роднай мове, тым часам яна становіцца сімвалам пратэстаў. Гэта дзіўна, даводзіў Валерый, і не паддаецца ніякай логіцы. Бо калі пра дзяржаўную сімволіку яшчэ можна нешта давесці і пераканаць, казаў ён, то пра мову нічога не патлумачыш, ніводны разважны чалавек не зразумее гэтага абсурду. Мова – велізарны народны скарб, які нельга прысабечыць ды яшчэ выкарыстоўваць з нейкіх брудных мэт.

Вось чаму я расцэньваю выказванне Прэзідэнта пра родную мову не як звычайную рэмарку кіраўніка дзяржавы ці як даніну павагі навукоўцам, сярод якіх ёсць і тыя, хто дбае пра яе па сваім прафесійным абавязку. Гэта досыць выразны сігнал грамадству, моладзі ў тым ліку. Мяркую, ён чаканы. Час паказаў: трыгерам раз'яднання беларусаў нашу родную мову зрабіць не ўдалося. Дык у нашых сілах, каб яна стала сімвалам яднання, той самай крыніцай, з якой нам чэрпаць сілы дзеля шчаслівага жыцця ў роднай краіне.

***Ігар ГАНЧАРУК***

Беларуская думка

Падпісацца на часопіс «Беларуская думка» ніколі не позна!

74938 ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ ПАДПІСКА
Кошт: 1 мес. – 4,31 руб., 3 мес. – 12,93 руб., 6 мес. – 25,86 руб.

749382 ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА
Кошт: 1 мес. – 12,33 руб., 3 мес. – 36,99 руб., 6 мес. – 73,98 руб.
(уключаючы падатак на дабаўленую вартасць)

Часопіс па падпісцы абыдзецца танней, чым набываць яго ў розніцу!